**Тухта, В.** БТР успыхнуў нібы факел / В. Тухта // Лепельскі край. — 2010. — 16 лют. — С. 2.

## БТР УСПЫХНУЎ НІБЫ ФАКЕЛ



Малая радзіма Аляксея Пыцько – Велеўшчына. Бацька Міхаіл Якаўлевіч і маці Ніна Маркаўна працавалі ў калгасе «Радзіма». У сям'і гадавалася яшчэ двое сыноў – старэйшы Михаіл і малодшы Васіль. Аляксей рос хлопцам кампанейскім, яго паважалі за адкрытасць і дабрыню.

У 1978 годэе Аляксей закончыў Слабадскую сярэднюю школу, паступіў у Лепельскую аўташколу ДТСААФ. Праз год юнака прызвалі на тэрміновую службу ў шэрагі Савецкай Арміі. Служыў ў Венгрыі, дзе ўдасканальваў навыкі сваёй грамадзянскай спецыяльнасці вадаіцеля. З Венгрыі бацькі атрымлівалі не частыя і скупыя на словы пасланні. Нечакана хлопец спыніў перапіску. Толькі цераз ваенкамат маці змагла даведацца, дзе знаходзіцца яе сын і тое, што з ім усё добра. Лаканічны адказ ваенных начальнікаў, іх дзяжурныя суцяшэнні не маглі супакоіць бацькоў. На працягу ўсёй далейшай службы яны моцна непакоіліся за лёс сына.

У той самы час, калі бацькі губляліся ў здагадках і абівалі ганкі ваенкамата, Аляксей адпраўляўся з Венгрыі ў Афганістан. У далёкай гарыстай краіне служыў вадзіцелем БТРа. Суправаджаў калоны з грузамі па горных дарогах. У час аднаго баявога задання бронетранспарцёр Аляксея падбілі, БТР успыхнуў нібы факел. Сам ён цудам застаўся жывы. Паспеў выхапіць з палаючай машыны аўтамат, а ваенны білет і іншыя дакументы згарэлі. Пасля гэтага выпадку хлопец лячыўся ў шпіталі – падчас бою быў кантужаны. Год і пяць месяцаў быў на мяжы жыцця і смерці. Яму пашчасціла, вярнуўся дадому жывы. Пасля гэтага ў ваенным білеце Аляксея з´явіўся запіс наступнага зместу: «З 02.02.1980 г. па 06.07.1981 г. аказваў інтэрнацыянальную дапамогу народу ДРА».

Як забыцца на тую праклятую вайну? Сябры лезлі з роспытамі.

Вярнуўшыся з Афганістана, Аляксей адразу ўладкаваўся на працу ў Лепельскі лясгас вадзіцелям. Праз пэўны час ктраўніцтва калгаса «Радзіма» пераманіла хлопца да сябе.

…Позняй восенню 1989 года Аляксей трапіў у аўтамабільную аварыю. Ад атрыманых траўм памёр на месцы дарожнага здарэння.

**Валерый Тухта**